*Слова рэдактара*

## Пётра Мурзёнак: Сучасныя нацыянальныя і геапалітычныя выклікі для Беларусі

*Анатацыя*. У артыкуле вызначаны тры гістарычныя перыяды каланізацыі беларусаў Расіяй, дадзена кароткая характарыстыка наступстваў сучаснай каланізацыі, праанлізавана сітуацыя ў Беларусі, уключна з перыядам пасьля Рэвалюцыі-2020. Абмяркоўваюцца магчымыя чатыры сцэнары развіцьця краіны, стан насельніцтва, узровень падтрымкі рэжыма Лукашэнкі і магчымая роль дыяспары ў далейшым лёсе Беларусі. *Матэрыялы артыкула дакладзены падчас круглага стала "Эвалюцыя Цэнтральна-Усходняй Еўропы - Новыя выклікі" (Evolution of Central Eastern Europe - New Challenges) на 5-м сімпозіуме Інстытута ім. Оскара Халецкі ў Канадзе, які адбыўся ў Атаве 25-26 кастрычніка 2024 года (гэта беларуская версія даклада, уключае некаторыя слайды, прадстаўленыя разам з дакладам аудыторыі на англійскай мове).*

**Дарагія сябры! Паважаныя калегі! Добры дзень!**

Мне вельмі прыемна быць удзельнікам гэтага актуальнага і своечасовага сімпозіума. Дзякую арганізатарам за запрашэньне. Я хацеў бы прадставіць вам сёньня:

- вельмі коратка гісторыю Беларусі,
- сучасную сітуацыю ў Беларусі,
- і перспектывы маёй радзімы.

### Кароткая гістарычная спраўка

Фармальна, СССР спыніў існаваньне 25 сьнежня 1991 года - на наступны дзень пасьля адстаўкі прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова. Ці быў распад СССР нечаканым? Так, гэта было нечакана. Нават 18 мільёнаў камуністаў КПСС не выйшлі на вуліцу абараняць дзяржаву рабочых і сялян. Аднак, напярэдадні былі наступныя прадвеснікі яго краху:

 ISSN 2562-950

- аб'яднаньне Германіі ў верасні 1990 г.;

- абраньне Леха Валенсы прэзідэнтам Польшчы ў кастрычніку 1990 г.;

- утварэньне ў снежні 1991 г. Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

І, нарэшце, усе 15 савецкіх рэспублік былога СССР паслядоўна дэкларавалі сваю незалежнасьць: фактычна Літва і Грузія аднавілі сваю дзяржаўнасьць да спробы дзяржаўнага перавароту ў Маскве 19 жніўня 1991 года, а іншыя зрабілі гэта пасля яе - Беларусь была 6-й, а Казахстан быў апошнім, з тых хто аформіў сваю незалежнасьць:

Літва – 11 сакавіка 1990 года (да спробы перавароту),
Грузія – 9 красавіка 1991 года (да спробы перавароту),
Эстонія – 20 жніўня 1991 года,
Латвія – 21 жніўня 1991 года,
Украіна – 24 жніўня 1991 года,
Беларусь – 25 жніўня 1991 года,
Малдова – 27 жніўня 1991 года,
Азербайджан – 30 жніўня 1991 года,
Кіргізстан – 31 жніўня 1991 года,
Узбекістан – 31 жніўня 1991 года,
Таджыкістан – 9 верасня 1991 года,
Арменія – 21 верасня 1991года,
Туркменістан – 27 кастрычніка 1991года,
Расія – 12 снежня 1991 года,
Казахстан – 16 снежня 1991 года.

Прэзідэнт РФ У.Пуцін называе распад СССР глабальнай гепалітычнай катастрофай. Аднак, безумоўна, што распад СССР быў выкліканы шэрагам аб’ектыўных прычын, абумоўленых невырашанасьцю нацыянальных пытаньняў на акраінах савецкай імперыі, эканамічнымі праблемамі, няўдалай акупацыяй Афганістана, і г.д. Але гэта не тэма маёй кароткай прэзентацыі.

Па форме савецкія рэспублікі атрымалі свабоду, вырваліся з каланіяльнай залежнасьці ад СССР, ад Расіі і ад расійскай імперыі. Аднак, ці атрымала Беларусь і шэраг іншых рэспублік СССР сапраўдную незалежнасьць?

Беларусь – адносна маладая дзяржава ў Еўропе. Упершыню атрымаўшы мадэрную дзяржаўнасьць 25 сакавіка 1918 года, Беларусь аднавіла сваю незалежнасьць пасьля

 ISSN 2562-950

25 жніўня 1991 года. У гісторыі Беларусі можна вылучыць тры перыяды каланіяльнай залежнасці ад Расіі:

**Перыяды каланізацыі Беларусі Расіяй** *(слайд 4)*

| **Перыяд** | **Кароткая характарыстыка** |
|---|---|
| **1795-1917** | першы каланіяльны перыяд доўжыўся з 1795 па 1917гг.: Беларускія землі і насельніцтва, пачынаючы ад Княства Полацкага, і часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай ніколі да таго не былі пад расійскай акупацыяй. |
| **1919-1991** | час існаваньня БССР |
| **сучасны, пачынаючы ад 26.05.1996** | працягваецца ад часу прыходу А.Лукашэнкі да ўлады і калі больш дакладна ад 26 мая 1996 года, калі афіцыйна былі парушаны межы між Беларусьсю і Расіяй |

Першы каланіяльны перыяд доўжыўся ў 1795-1917 гадах пасля падзелу Рэчы Паспалітай – Садружнасьці Двух Народаў - паміж трыма імперыямі. Хачу падкрэсьліць, што беларускія землі і насельніцтва да 1795 году ніколі не былі пад расейскай акупацыяй. Другі пэрыяд ахоплівае час існаваньня Беларусі як Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, гэта значыць з 1919 па 1991 год. А цяпер мы маем сучасны пэрыяд каланізацыі, які працягваецца ад часу прыходу да ўлады А.Лукашэнкі. Давайце прадэманструем пару слайдаў, адпаведна тым перыядам. Калі мы глянем на карты ХУІІ ст., то заўважым, што беларускія землі складалі абсалютную большасьць тэрыторыі тагачаснага ВКЛ – беларускія землі ў сучасных межах разьмяшчаліся ў 9 з 10 ваяводстваў ВКЛ.

Калі мы глянем на карты ХУІІ ст., то заўважым, што беларускія землі складалі абсалютную большасьць тэрыторыі тагачаснага ВКЛ – беларускія землі ў сучасных межах разьмяшчаліся ў 9 з 10 ваяводстваў ВКЛ.

Такім чынам, толькі з 1775 года беларусы надоўга трапілі пад еўразійскі\расійскі ўплыў, страціўшы сваю еўрапейскую прыналежнасьць.



**In 1654, Belarusian lands were on nine of total ten provinces of the GDL**
*(map prepared by A.Karalkevich; слайд 5)*

Невялікі прасьвет ад  каланіяльнага рабства прыпаў на час існаваньня Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) ў 1918 годзе - але ён доўжыўся ўсяго толькі 9 месяцаў. На прадстаўленым здымку, чальцы беларускага ўрада БНР, які дзейнічаў у 1918 годзе ва ўмовах германскай акупацыі.



**Першы беларускі ўрад – урад БНР 20 лютага 1918 года**
*Злева направа: сядзяць* – А.Бурбіс, І.Серада, Я.Варонка, М.Захарка, *стаяць* – А.Смоліч, П.Крачэўскі, К.Езавітаў, А.Аўсянік, Л.Заяц *(слайд 6)*

Але далей, пачынаючы, ад 1 сьнежня 1919 года, калі была створана савецкая “Белоруссия” і да 1991, мы можам казаць пра другі перыяд каланізацыі Беларусі Расіяй.

Непасрэдна пасьля атрыманьня незалежнасьці ў 1991 г., Беларусь яшчэ мела шанс вырвацца з каланіяльнай залежнасьці ад Расіі, але тое не сталася як ў выніку няздольнасьці БНФ ў кіраваньні палітычным працэсам, так і негатоўнасьцю беларускага насельніцтва да перамен. Безумоўна, у такіх умовах каланіяльная спадчына не магла зьнікнуць наўрост і адразу.

Больш таго, надзеі на рэальную незалежнасьць былі спынены ў 1994 годзе з прыходам да прэзідэнцкай улады А. Лукашэнкі – асобы савецкай і антынацыянальнай па сваёй ментальнасьці і сьвядомасьці. 14 мая 1995 года, менш чым праз год пасьля прыходу да ўлады, ён правёў свой першы рэферэндум аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй, за якую станоўча выказаліся 83.3% беларусаў. А ўжо праз год, 26 мая 1996 года, прэм’ер міністр Расіі В. Чарнамырдзін разам з А. Лукашэнкам у знак пачатку інтэграцыі сімвалічна ліквідавалі беларуска-расійскую мяжу, выкапаўшы памежны слуп на трасе «Брэст–Масква».

Мы лічым, што з таго моманту (26.05.1996) і па сёняшні дзень адбываецца трэцяя каланізацыя Беларусі Расіяй, якую можна ўмоўна назваць “мяккай каланізацыяй”. Відавочна, што адным выкапываньнем сталбоў на мяжы не абыйшлося - 2 красавіка 1996 года Аляксандр Лукашэнка і прэзідэнт РФ Барыс Ельцын падпісалі дагавор аб стварэньні Садружнасьці Беларусі і Расіі, якая пазьней пераўтарылася ў Саюз Беларусі і Расіі.

**Сучасная сітуацыя ў Беларусі**

Што сталася вынікам трэцяй нео-каланізацыі Беларусі Расіяй? *(слайд 8)*:

- Эканамічная залежнасьць: каля 50% беларускага экспарту і імпарту завязана на Расію (каля 90% экспартуемага мяса і малака ідзе ў Расію, каля 95% паставак нафты ў Беларусь ідзе з Расіі);
- Ваенна-палітычная залежнасьць (саюз Расіі і Беларусі, АДКБ, уцягваньне Беларусі ў вайну супраць Украіны),
- Вынішчэньне усяго нацыянальнага і беларускага як да Рэвалюцыі 2020, так і пасьля яе.

Я вельмі ганаруся Рэвалюцыяй-2020, калі ў некаторыя дні на вуліцах Мінска было больш за 400 тысяч пратэстоўцаў.




***Народна-дэмакратычная Рэвалюцыя-2020***
*(Мінск, 16 жніўня 2020 года)*

Аднак рэвалюцыя 2020 пацярпела паразу. Зараз у Беларусі ў турмах пакутуюць каля 2 тысяч палітвязняў. Каля 600 тысяч актыўных беларусаў былі вымушаны пакінуць краіну за апошнія чатыры гады. Грамадзянская супольнасьць у Беларусі разгромленая – зачынены СМІ, няўрадавыя грамадзкія арганізацыі і г.д. Рэжымам Лукашэнкі было зруйнавана шмат каштоўнага для нацыі – зруйнавана амаль усё, што будавалася шматлікімі намаганьнямі многіх патрыётаў Беларусі. Я тут кажу пра этнацыд беларусаў.

**Сцэнары для Беларусі**

Якая будучыня ў Беларусі? Прагнозы даваць складана, асабліва ва ўмовах калі ідзе вайна Расіі супраць Украіны, краіны, якая паводле маёй гіпотэзы ёсьць партнёрам Беларусі па Заходне-Рутэнскай цывілізацыі. Я прывяду 4 магчымыя сцэнары для Беларусі – дэтальна апісаных у маёй нядаўняй манаграфіі без удакладненьня дэталяў, якія б сьведчылі ў карысць таго ці іншага сыходу (слайд 10):

## Scenario and Probable Outcomes for Belarusian Nation

| | |
|---|---|
| **Scenario 1** | **Remain in the same situation as today and be absorbed by Russia** |
| **Scenario 2** | **Go “voluntarily” into “the Russian world” as a colony or one of the subjects of the Russian Federation** |
| **Scenario 3** | **Become a member of the EU** |
| **Scenario 4** | **Become a real neutral country with gradual accession to a common security system** |

10

Першыя два сцэнары надзвычай небяспечныя для Беларусі, паколькі прадугледжваюць яе інкарпарацыю ў «рускі сьвет» у якасьці суб'екта Расійскай Федэрацыі. Паводле апошняга апытаньня, каля 40% беларусаў па-ранейшаму схільныя да Расіі.

Трэці сцэнар — напрамак на ЕС — за які сёлета прагаласавалі ўрад С.Ціханоўскай і абраная Каардынацыйная рада Беларусі. Паводле апошняга апытаньня, гэты кірунак падтрымліваюць каля 20% беларусаў.

Сцэнар 4 - пра нейтралітэт Беларусі - даволі складаны. Асабіста я прыхільнік гэтай ідэі, але сябры крытыкуюць мяне за гэта. Акрамя таго, мы бачым негатыўны прыклад Украіны, а таксама страту нейтральнай “нявіннасьці” Швецыяй і Фінляндыяй у мінулым годзе.

Усе гэтыя сцэнары, відавочна, у ва многім яны будуць залежаць ад вынікаў вайны і ад магчымага ўсталяваньня новага прадку ў сьвеце Вялікімі краінамі.

Ёсьць яшчэ адзін даволі неверагодны сцэнарый, у якім Беларусь можа ўдзельнічаць разам са сваімі гістарычна блізкімі краінамі-суседзямі, якія магчыма дазволіць адмежавацца ім ад агрэсіўнай Расіі – гэта рэалізацыя сумеснага Балта-Чарнаморскага праекта “Міжмор’е” ці "Intermarium”,[1] прапанаванага яшчэ ў 1919-

[1] Jonathan Levy (6 June 2007). *The Intermarium: Wilson, Madison, & East Central European Federalism*. Universal-Publishers. pp. 166–167. ISBN 978-1-58112-369-2. Retrieved 11 April 2011.

1921 гг., Іосіфам Пілсудскім; меркавалася, што туды ўвайшлі б краіны усходняй і цэнтральнай Еўропы, уключна з Беларусьсю.

Пытаньне аб'яднаньня з Балтыйскімі краінамі абмяркоўвалася ўрадамі БНР пад кіраўніцтвам Луцкевіча (1919)[2] і Ластоўскага (1920).[3] У 1990-1993гг., Беларускі Народны Фронт абмяркоўваў ідэю стварэньня Балта-Чарнаморскага нафтавага калектару з мэтай пазбавіцца энэргетычнай залежнасьці ад Расеі (аўтары эканамічнай часткі праекта С. Гусак ад Беларусі і М. Байчышын ад Украіны).[4] Ва Украіне новаствораны Міжнародны цэнтр балтыйска-чарнаморскіх дасьледаваньняў правёў канферэнцыю прысвечаную ідэі стварэння Балта-Чарнаморскага Саюза (у склад рады старэйшын новай Балта-Чарнаморскай ініцыятывы ўвайшлі былыя кіраўнікі Беларусі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Малдовы, Эстоніі).[5] Відавочна, што такі рэгіянальны праект з'яўляецца эканамічна выгадным для яго удзельнікаў, аднак, яго палітычная рэалізацыя ў нашы дні выглядае малаверагоднай, як у сілу рознага ўзроўню эканамічнага развіцця краін, так і іх прыналежнасьці да розных геапалітычных утварэньняў. Тым не менш, гэта ідэя да нашага часу застаецца актуальнай і тэарэтычна магчымай.

### Перспектывы для Беларусі

Як Беларусь можа пазбавіцца каланіяльнай залежнасьці ад Расіі? Каб адказаць на такое пытаньне глянем на іракоў і на іх патэнцыял на беларускай сцэне.

---

[2] Memorial on the attitude of the Belarusians to a possible federation on the east of Europe, composed of A. Lutskevich in Paris. 1919. BNR archives, V.I, Book 1, 1228, p.356-358. Мемарыял аб стаўленні беларусаў да магчымай федэрацыі на ўсходзе Еўропы, складзены А. Луцкевічам у Парыжы. Архівы БНР, т.I, Кн.1, 1228, с.356-358.

[3] Memorandum of the BDR Government of 12.08.1920 to the Presidium of the Conference of Baltic States in Riga with information about Belarusian Democratic Republic. BNR archives, V.I, Book 1, 2223 p.835-840. Мемарандум ураду БНР за 12.08.1920 Прэзідыўму канферэнцыі Балтыцкіх дзяржаваў у Рызе з інфармацыяй пра Беларускуб народную рэспубліку. Архівы БНР, т.I, Кн.1, 2223, с.835-840.

[4] Станіслаў Гусак: «Балта-Чарнаморскі калектар даў бы Менску дадатковыя козыры на перамовах з Масквой». 11.10.2007. Хартия-97. https://zautra.by/news/news-1069

[5] Elena Litvinova New breath of the Baltic-Black Sea Initiative: joined by former leaders of the region and Russia's representative. Radio "Liberty". 12.02.2016. https://www.svaboda.org/a/28153065.html
Алена Літвінава Новае дыханьне Балта-Чарнаморскай ініцыятывы: далучыліся былыя кіраўнікі краін рэгіёну і прадстаўнік Расеі. Радыё "Свабода". 2.12.2016. https://www.svaboda.org/a/28153065.html

 ISSN 2562-950

## Actors and Potential for Changes in Belarus

- **Population readiness**
- **Level of Support of Lukashenka regime**
- **Diaspora Support**
  - **S.Tsikanouskaja Office and Government**
  - **Rada BDR in Exile**
  - **Central and Eastern European Council in Canada (CEECC) and Diaspora Communities**
- **Outcome of Ukraine-Russia War and New World Security**

11

***Насельніцтва***

Па нашых разліках, у канцы 2016 года ў свеце пражывала каля 9.5 мільёнаў этнічных беларусаў, з іх каля 8 млн на радзіме, 1.1 млн ў блізкім замежжы і каля 0.5-0.6 млн у далёкім замежжы. Пасьля рэвалюцыі 2020 года, у выніку рэпрэсій лукашэнкаўскага рэжыму, за мяжой, па неафіцыйных зьвестках, апынулася яшчэ 400-600 тыс. актыўных беларусаў. Такім чынам, умоўна можна лічыць, што больш за 2 млн беларусаў або амаль кожны пяты этнічны беларус жыве зараз па-за межамі краіны.

Важна пазначыць, што 84.9% людзей у Беларусі паводле цэнзуса 2019 года - вызначаюць сваю нацыянальнасьць як беларускую. Але колькі з гэтых людзей ёсьць нацыянальна-арыентаванымі? Па нашых ацэнках, доля “сьвядомых” людзей у Беларусі перад Рэвалюцыяй-2020 не перавышала 25% (прыблізна тое, што атрымалі падчас выбараў першага прэзідэнта краіны ў 1994 годзе). Відавочна, што пасьля паразы Рэвалюцыі-2020 варта было чакаць яе зьмяншэньня, што і падцьвердзілі вынікі нядаўняга апытаньня. З 4-х сегментаў, выдзеленых падчас апытаньня - доля сьвядомых беларусаў (беларускі і касмапалітычны сегмент) склала толькі 13% (зноў жа гэта сьведчыць і аб невысокім нацыянальным настроі беларусаў).[6]

---

[6] Колькі сярод беларусаў свядомых, а колькі русіфікаваных? Вынікі новага даследавання https://nashaniva.com/332267 ад 15.12.2023.

Аднак, былі вызначаны яшчэ два сегменты беларусаў - а менавіта, нацыянальна-індыферэнтныя беларусы (памяркоўныя) і тыя што вызначаюцца між сьвядомымі і савецкімі, якія разам складаюць 46% (19%+27%)! Менавіта з імі магчыма працаваць з тым, каб іх арыентацыя\нацыянальная ідэнтыфікацыя мянялася на пра-беларускую.

Канешне, можна марыць, што некалі так і станецца і доля нацыянальна-арыентаваных людзей па крайней меры перавысіць палавіну. Адзіны магчымы шлях, каб дасягнуць такой мэты бачу толькі праз асьвету і адукацыю. У цяперашніх умовах цяжка ўявіць, што адукацыя можа быць такім інструментам на радзіме. Значыць, застаецца толькі асьвета – аб чым я не перастаю казаць у публікацыях. На самой справе – асьвета – маё “крэдо” – менавіта яно падахвочвала мяне запачаць асьветніцкі праект – вэб-часопіс “Культура. Нацыя”.

***Узровень падтрымкі рэжыма Лукашэнкі***

Намі былі праведзены разлікі колькасьці прыхільнікаў Лукашэнкі ў чатырох прэзідэнцкіх выбарах (1994-2015гг.); разлікі грунтаваліся на афіцыйных зьвестках і на выніках неафіцыйных апытаньняў. Было вызначана, што колькасьць яго прыхільнікаў у гэты перыяд была больш-менш стабільнай, і вагалася між 2.5 і 3.5 млн чалавек. Сярэдняе з 4 выбараў хто галасаваў - склала - 6.158.783 чалавек, з іх 2.992.760 чалавек або 3.0 млн - гэта, так выглядае, цьвёрдыя прыхільнікі Лукашэнкі – гэта і ёсьць яго электарат! Гэта значыць, што ўсе астатнія людзі, а гэта прыблізна каля 3.2 млн чалавек адназначна былі не за Лукашэнку (6.158.783 – 2.992.760=3.166.023).

Аднак, Лукашэнка утрымлівае сваю ўладу як праз фальсіфікацыі, так і праз жорсткую сістэму вертыкальнай улады. Яму нічога не каштуе ведаць і прызначаць каля 200 кіраўнікоў раённых адміністрацый. Ён зноў рыхтуецца да наступных выбараў, прызначаных на 26 лютага 2025 года - без відавочнай альтэрнатывы і супраціву.

***Падтрымка дыяспары***

Некалькі сказаў пра дыяспару. Цяпер мы маем даволі нестандартную сытуацыю, калі за мяжой дзейнічаюць два беларускія ўрады – Рада БНР у выгнаньні пад кіраўніцтвам Я. Сурвіллы і ўрад С. Ціханоўскай, прадстаўлены яе офісам і Каардынацыйнай радай Беларусі. Спадзяюся, абодва ўрады будуць працаваць творча і разам.

Беларускія суполкі ў Канадзе і ва ўсім свеце стараюцца зрабіць усё магчымае – пратэсты і маніфестацыі, падтрымка палітвязняў і байцоў палка Каліноўскага, якія ваююць у складзе ўзброеных сіл Украіны. Прадэманструем пару слайдаў менавіта

пра дзейнасьць беларусаў у Атаве, да якой я меў непасрэднае дачыненьне як лідэр беларусаў у гэтым годзе з 2000 па 2022 гг.

У Атаве праходзілі палітычныя акцыі па розных нагодах, у тым ліку ў падтрымку Рэвалюцыі-2020. А таксама, сьвяткаваньні Нацыянальных падзеяў – 32-й сустрэчы беларусаў Паўночнай Амэрыкі ці 100-годзьдзя БНР.

Асобна хачу адзначыць, супрацоўніцтва зь іншымі дыяспарамі ў сталіцы Канады. Мы лічым, што Рада Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы ў Канадзе (CEECC), якая адыгрывае значную каардынацыйную ролю ў жыцьці дыяспараў, магла б прыкласьці больш намаганьняў у падтрымку як Беларусі, так і асабліва Украіны – ключавой краіны, дзе вырашаюцца многія пытаньні будучыні чалавецтва і дэмакратыі ў наш час.

**Piotra Murzionak: Contemporary national and geopolitical challenges for Belarus**
***(web-magazine "Culture. Nation", issue 34, November 2024, 5-15, www.sakavik.net)***

*Abstract*. The article identifies three historical periods of colonization of Belarusians by Russia, gives a brief description of the consequences of modern colonization, analyzes the current situation in Belarus, including the period after the Revolution-2020. Four possible scenarios of the country's development, the state of the population, the level of support for Lukashenka's regime and the possible role of the diaspora in the future fate of Belarus are discussed. The materials of the article were presented during the round table "Evolution of Central Eastern Europe - New Challenges" at the 5th symposium of the Institute. Oskar Halecki in Canada, which took place in Ottawa on October 25-26, 2024.

**Пётра Мурзёнак: Современные национальные и геополитические вызовы для Беларуси**
***(веб-журнал "Культура. Нация", вып. 34, ноябрь 2024, 5-15, www.sakavik.net)***

*Резюме*. В статье выделяются три исторических периода колонизации белорусов Россией, дается краткая характеристика последствий современной колонизации, анализируется современная ситуация в Беларуси, в том числе в период после Революции-2020. Обсуждаются четыре возможных сценария развития страны, состояние населения, уровень поддержки режима Лукашенко и возможная роль диаспоры в дальнейшей судьбе Беларуси. Материалы статьи были представлены в ходе круглого стола «Эволюция Центральной Восточной Европы – Новые вызовы» (Evolution of Central Eastern Europe – New Challenges) на 5-м симпозиуме Института Оскара Халецкого в Канаде, который проходил в Оттаве 25-26 октября 2024 г.